*Я. І. Міронччык*

# Беларуская літаратура X–XIX стст.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

*Я. І. Мірончык*

# Беларуская літаратура X–XIX стст.

*Вучэбна-метадычны дапаможнік
для вучняў педагагічных класаў*

Мінск 2001

УДК 821.161.3:82(091)(075.8)
ББК 83.3(4Беи)1я73
М641

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

Зацверджана на пасяджэнні кафедры методыкі выкладання інтэграваных школьных курсаў (пратакол № 9 ад 6 сакавіка 2001 г.)

*Рэцэнзент І. М. Слесарава,* кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры філасофіі і гуманітарных праблем адукацыі АПА

**Міронычык Я. І.**
М641 Беларуская літаратура X–XIX стст.: Вучэб.-метад. дапам. — Мн.: БДПУ імя М. Танка, 2001. — 78 с.
ISBN 985-435-349-4

У дапаможніку разглядаецца гісторыя развіцця беларускай літаратуры ад старажытных часоў эпохі Сярэднявечча і да канца XIX ст. Дыдактычны матэрыял ахоплівае асноўныя раздзелы школьнай праграмы па беларускай літаратуры для 10 класа і адпавядае патрабаванням праграмы для паступаючых у ВНУ.

Адрасуецца вучням педагагічных класаў. Можа быць выкарыстаны навучэнцамі факультэта даінстытуцкай падрыхтоўкі.

**ББК 83.3(4Беи)1я73**

ISBN 985-435-349-4
© Я. І. Міронычык, 2001

## Прадмова

Літаратура Беларусі ў эпоху Сярэднявечча надзвычай багата помнікамі царкоўна-рэлігійнай і свецкай пісьменнасці. У новым тысячагоддзі мы зноў цікавімся, як і чым жылі нашы продкі, што іх хвалявала, наколькі высокім быў іх інтэлектуальны і духоўны узровень, якую спадчыну яны пакінулі сваім нашчадкам і якое месца займалі ў сусветнай супольнасці.

Літаратурныя помнікі пра далёкае мінулае Беларусі, яе рэлігійнае і культурнае жыццё, пра яе сувязі і узаемаадносіны з іншымі краінамі Еўропы і Усходу увайшлі у скарбонку духоўнай культуры эпохі Сярэднявечча. Пазнавальна-дыдактычнае або гнасеалагічнае значэнне старадаўняй культуры абумовіла узнікненне розных філасофска-эстэтычных канцэпцый як у літаратуры Старажытнай Грэцыі і Рыма, так і у інтэграванай міфатворчасці славян.

Літаратура Сярэднявечча, гэта значыць літаратура феадальнага грамадства, у сваім гістарычным развіцці прайшла некалькі этапаў: ад апалагетыкі да патрыстыкі (II–V стст. н. э.), да ранняй (IX–XII стст.), затым больш позняй (XIII ст.) схаластыкі і да яе заняпаду (XIV–XV стст.). У якасці метадалагічнай асновы патрыстычнай літаратуры выступала багаслоўнае вучэнне, якое адмаўляла ролю чалавечага розуму у пазнанні свету, супрацьстаяла міфалогіі язычніцтва. Разам з тым, дагматы хрысціянства былі несумяшчальнымі з антычнай культурай і філасофіяй. Нягледзячы на гэта, пачынаючы з III ст., патрыстыка імкнулася выкарыстаць дзеля сцвярджэння хрысціянства філасофію элінізму, у аснове якой палягала ідэалістычная тэорыя Платона аб містычнай эманацыі (выпраменьванні) матэрыяльнага свету з духоўнага пачатку. Па гэтай прычыне шырокае распаўсюджанне ў Еўропе мелі не толькі творы Свяшчэннага пісання, але і грэка-візантыйскія хронікі і аповесці, якія давалі сярэднявечнаму чытачу уяўленне аб антычнасці. Асноўныя праблемы філасофіі – Бог і свет, вера і розум, прырода агульных паняццяў – вырашаліся ў рэчышчы рэлігійна-ідэалістычных уяўленняў. Разам з тым, з часу распаду Рымскай імперыі (V ст.) у Заходняй Еўропе (найперш, у Германіі) і на землях усходніх славян вялікі уплыў на грамадства мелі жрацы і вяйдэлоты, якія актыўна распаўсюджвалі язычніцкую культуру.

У XI–XII стст. склаўся гераічны эпас, прадстаўлены такімі творамі французскага і іспанскага рыцарства, як "Песня аб Раландзе" і "Песня аб Сідзе". У аснове германскага эпасу былі старажытныя паданні часоў "вялікага перасялення". "Песня аб Нібелунгах" (1200) апавядае пра гібель Бургундскага каралеўства, зруйнаванага ваяўнічымі гунамі ў 437 г. У гэты час узніклі арыгінальныя творы ўсходніх славян – "Аповесць мінулых гадоў", "Слова пра паход Ігаравы", "Тураўскае евангелле", "Супрасльскі рукапіс" і "Дыёптра", у якіх аўтары выкарыстоўвалі народныя сродкі мастацкай вобразнасці дзеля асвятлення гістарычных падзей X–XII стст.